БЕЛАРУСКІ ШЛЯХ

Адрэс рэдакцыі і адміністрацыі:
ерпухоуская вул. д. № 12

эдакцыя адчынена ад 1 до 2 гадз. пасьля поудня.
аміністрацыя—зрана ад 10 да 2 гадз.
У вечары ад 5 да 7 гадз.

эдакцыя пакідае за сабой права пазауляць перасыланые рукапісы і карэспондэнцыі.

Цана асобн. нум. 15 к.

Надпіска: з дастаукай да д му у Мінску на 1 месяц 3 рублі.

Цана абвестак:
за верш вэтыту на 1-й стран. 1 ру
на апошняй—50 кап.

Штодзенная грамадзка-палітычная газэта.

№ 31. Менск. Панядзелак 29 красавіка 1918 г. Год I

Менск 29/IV.

Гэрманія і Беларусь.

Гэрманію ад беларускай зям... аддзеляець літоускі і поль... і народы. Ад нашаго Бела... ока да нямецкай старой гра... цы—70 верст Наш край гэ... тыповы лесны бассэйн гдзе ...чынаюцца рэкі: Дняпро-вод... я дарога «з варагі у грэкі», ... каторай Беларусь пасылае ...с для стэповай Украіны; у ...алтыку цякуць з нашаго краю ...-Дзьвіна, Неман і беларускія ...рытокі Віслы. Дзьве з гэтых ...дных артэрый нашых маюць ...ыхад у Гэрманію. Дняпро праз ...рымітыуныя каналы злучаецца з сыстэмай Віслы. Калі разь...цць добра сыстэму каналоу ... с кожнай беларускай гу...эрні можна будзе дапльць у ...уропу.

Для Вітэбшчыны і Смален...чыны бліжэйшы таргові пункт—Рыга, для Вільны—Лібава; ...ля Магілеушчыны, Гродзен...чыны, як і для Менска—Ке...ігсбэрг будзе бліжэй, як Лі...ава, калі правясьці жалезную ...арогу ад Менска на Ракоу, ...ершай, Араны. У часе вай...ы кавалкі гэтай дарогі нача...і рабіць.

У нас зернавая сыстэма ...ельскай гаспадаркі замяцілася ...а троху скатаводнай. Наш ...рай купляець сам зерна, каля 20 мільенау пуд. у год, найбольш з Украіны і палудзеннай чорназемнай Вялікаросіі. Мы пачалі выраблядь экстракты з прадуктау палеу: спірту на якіх 60 міл. руб., крахмал, мясо, свіней, яйца, птаство, масла, сыры, фрукты, ягады, мармэлады, варыва. Глауным рынкам для гэтаго быу Захад, для спірту і вэндліны—Маскоушчына і Сыбір. Індустрыя у нас развівалась дрэва-абдзелачная і прадуктау сельскай гаспадаркі. Самы глауны фабрыкат пасьля дрэва быу спірт, на каторым трымалася бульбяная гаспадарка. Для Беларусі таможэнная конвэнція з Гэрманіей была вельмі выгодная. Нам патрэбны танныя машыны, прылады гаспадарскія, усялякія фабрыкаты мэханічнай, хімічнай і мануфактурнай індустрыі, каторых у нас німа і можа і ні будзе, бо некатоных прыродных багацствау, як розных металоу, каменнаго вугля у нас німа. З другого боку мы маем і будзем мець,—дзякуючы нашаму зямельнаму абшару і рэдкаму насяленню,—поуную можнасьць бязмежно расшыраць продукцыйнасьць нашаго земляробства.

Для гэтаго патрэбна, каб Беларусь мела нізалежнасьць у сваім палітычным жыццю. У культурным і соцыяльным устройстве каб брала прыклады с суседняй Гэрманіі, на каторую апіраючыся Беларусь можа выйсьці з тупіка, у якім яна сядзіць цяпер. Можа Беларусі адкрыецца шырокая дарога прамежуточнай дзержавы паміж Захадам і Усходам, каторай экапамічныя і культуральныя інтарэсы больш схіляюцца да Гэрманіі, як да Маскоушчыны. Трэба прыпомніць сабе, што некалі нашы прадзяды, стварыушыя і бараніушыя беларуска-літоускую дзержаунасць, на працягу 150 гадоу ваевалі з Масквой. 120 гадоу наш край быу «забраны» Масквой. Культура з Масквы і Пецярбургу была ніжэйшая нашэй, яна толькі затрымлівала нашае развіцце. Страшная вайна моцна збурыла наш край. Дык вось толькі апіраючыся на высока культурныя захадныя дзержавы мы можам ураташвацца. Анархія у Вялікаросіі збурыць яе да нібывалаго у гісторыі способу. Ужо прайшла чэрада гэгэмоніі Масквы.

Абразкі с правінцыі.

(Па даугінаускаму гасьцінцу.)

Абозы, абозы і абозы. Едуць у Менск, едуць з Менску. Гэта розныя крамнінкі Даугінава, Докшыцы, Глыбокаго, Ільлі, Крайску і др. Хто вязе тавар з Менску, (болей ўсяго табаку і мануфактуру, а хто у Менск (яйкі, куры, масло і др.) а шмат хто едзе проста у Менск «па цану». Тавару дома хватае, толькі цаны ні ведаюць, бо кожныя тры дні ўсё новыя цэны...

Спатыкаюцца знаёмыя людзі. Талкуюць аб «керэнках», аб старых і аб нямецкіх грашох. На вёсках ідуць толькі «мікалаеўскія» грошы. Устрэчны—папярэчны талкуюць аб палітыцы. У газэціне ужо ні заварачываецца сялёдка, таксама ні ужываецца газэта на «банкроткі», а перадаецца з рук у рукі, як скарб. Нават ніграматныя людзі і то пачалі смакаваць газэту.

Спатыкаю на гасьціпцу знаёмаго чалавека з блізкай вёскі.

— Здароў, сусед Пархвен!

— Здароў!

— Чаму так пастарэў?—пытаўся у яго.

— Ад нуды...—кажа Пархвен.—Э-хэ-хэ, чатыры гадкі вайны... Адзін сын згінуў зусім на вайне. Другі—у палоне ды ужо даўно вестачкі ад яго ні маю, а трэйці яшчэ ні вярнуўся з Расіі. Гэта ні жартачкі якія...

Пархвен ківае сьаёй бядовай сівай галавой і сумнымі вачыма пазірае на мяне.—Ні жартачкі.—згаджаюся я з ім. Але ні усьпеў я яшчэ слова дакончыць, як Пархвен адскочыў ад мяне у другі бок, кудысь рвануўся і паляцеў. Бачу, ажна ідуць с катомкамі за плячыма тры запыляныя, ўспацеўшыя салдацікі, а Пархвен, мабыць, хоча даведацца «Што чуваць» Скуль і куды ідуць?»

Гэта «што чуваць»?» раздаецца цяпер ўсюды. Кожнаго цікавіць доля тутэйшай зямлі,—да каго яна будзе належаць. Кожны талкуе на свойму і ніблыцы творуцца на кожным кроку. Кожны ніцярпліва чакае канца. Кожны ужо хацеў-бы троху адпачыць і душой і целам ад усей гэтай завірухі. І праклынаюць людзі сваіх быўшых агітатараў, якія вучылі іх, як правесьці «волю народную».

— «Гэта «рараты» (аратары) нас давялі да таго, што ні у зад, ні у перад».—жалюцца вясковыя людзі.—Што гэта будзе?—пепакоюнца яны, бо пужаюцца караў за большэвізм...

Яны напамінаюць аглупаных, ўзрослых дзяцей у сваёй наіўнай шчырасьці, у сваей массавой цемнаце...

Нейкі пякельны жарт—кпіну устроіла рэвалюцыя над нашым народам... Так ўзбударажвалі іх рознымі ідэямі, так вялікі жыццевыя кантрасты, што у мазгох селяніна гэта ні тоўпіцца і ён стаіць разняўшы рукі, у вялікай роспачы, як малое дзіця, заблудзіўшаеся на нівядомым шляху...

З.

На беларускім шляху.

Хадок с Новагрудка.

У Народны Сэкрэтарыят Беларускай Народнай Рэспублікі прыехаў відны прэдстаўнік з места Новагрудка (старадаўняй сталіцы Беларуска-Літоўскаго Княжства). Хадок намалеваў абраз жыцця заакопнай часьці Гродзеншчыны і Меншчыны, орыентацыю тамтэйшых грамадзянскіх дзеячоў, жыцце Новагрудка, Дзятлова, Слоніма. Глаўнае упраўленне гэтай часьці Беларусі знаходзіцца у Беластоку. Там даведаліся а беларускім руху с прамовы генэрала фон-Гофмана на мірнай канфэрэнцыі у Бярэсьці, а пасьля з газэт «Гоман», «Русскій Вѣстникъ» «Дзеннікъ Виленскій».

Дэлегацыя з Кіева.

Гэтымі днямі з Кіева прыехала у Менск па справах Народн. Сэкрэтарыяту дэлегацыя,—прэдстаўнік «Беларускай арганізацыі на Украіне»—А. К. Галавінскі і прэдстаўнік грамадзянска-культурнаго клюбу—«Зорка»—І. А. Фарботка.

Дэлегаты перадалі Народнаму Сэкрэтарыяту погляд Урада Украінскай Народнай Рэспублікі аб мірных перагаворах апошняй з Вялікаросіяй, аб тым, што ужо фактычна Украінскі Урад прызнаў нізалежнасьць Беларусіі, аб чым хутка апавешчано ўсім дзержавам.

Дэлегаты Рады Рэспублікі С. А. Рак-Міхайлоўскі і А. І. Цвікевіч вядуць цяпер перагаворы сурьёзнаго характару з Народным Міністрам Закардонных спраў Украіны. а так—сама з нямецкім паслом на Украіне фон-Муммом.

У Кіеві цяпер устаноўлены «Беларуская Гандлёвая Палата», «Беларуска - Украінскае Т-во Злучэння», куды увайшлі гэтакія украінскія дзеячы, як праф. Грушэўскі, Ефрэмоў, Дорошэнко і др.

Беларуская Рада і польская меньшасьць.

Як вядома, польская меньшасьць на Беларусі у асобе Рады Польскай Менскай губ. ні уздаволілася 4-мя мейсцамі для Палякаў, у Беларускую Раду ні увайшла, вымагаючы 10 мейсцаў [усяго меньшасьцям дапо 15 мейсц, у том ліку 7—еўрэям, 4-палякам, 2—вялікарусам, 1—украінцам і 1—літвінам].

Старшыня Народнаго Сэкрэтарыяту Я. Я. Варонка, да каторага палякі зьвярнуліся з асобай дэкларацыяй, перадаў рашэнне гэтаго пытання фракцыям Рады. Фракцыі Рады да едзінаго рашэння ні прышлі, лічучы вымаганні палякоў ні грунтоўнымі. Ні прышлі да рашэння дзеля таго, што палякі фактычна, апрача дадзеных ім 4-х мейсцоў, маюць іщчэ чатыры мейсцы у ліку прэдстаўнікаў гарадоў і земстваў.

Старшыня Народнаго Сэкрэтарыяту перадаў гэта пытанне рашэнне Радзе Рэспублікі.

Асобаупоунамоцны Укр. Нар. Рэспублікі пры Нар. Сэкрэтарыяце.

Гэтымі днямі прыедзе у Менск Асобаупоўнамоцны Укр. Нар. Рэспублікі пры Народн. Сэкрэтарыяце Беларускай Народнай Рэспублікі, назначаны для гэтай мэты Народным Міністрам закардонных спраў Украіны,

Пачтова-тэлеграфныя справы.

У зьвязку з распараджэннем Народнаго Камісара Почт і тэлеграфаў так званай «Расійскай Фэдэратыўнай Савецкай Рэспублікі» аб тым, каб Упраўленне пачтово-тэл. округа, што знаходзіцца цяпер у Менску, эвакуіровалося у Маскву з усім складам, дзеламі і мечкем.—Старшыня Нар. Сэкрэтарыяту Бел. Нар. Рэс-

спублікі Я. Я. Варонка бяседаваў з Упраўляючым Менскім Пачтово-Тэлеграфным Округам І. Шульцам разам с прадстаўнікамі служачых п. п. Коваленко і Мержэвым з мэтай выясніць, як маюць яны выпаўніць пастановы Народнаго Камісара з Масквы.

Прадстаўнікі Округа згадзіліся з мненнем Народнаго Сэкрэтарыяту, што пасьля Актаў Рады Беларускай Нар. Рэспублікі вывазу установаў з Рэспублікі ні можа быць дапушчэно.

Як аказалося, б. Начальнік Округа, п. Нікіфароў, ішчэ нідаўна быўшы у Менску, цяпер знаходзіца у Маскве, адкуль і дае «належачыя» распараджэнні.

На Украіне.

Газэта «Кіевская Мысль», у № 57 за 21 красавіка, піша: 19 красавіка, як паведамляе У. Т. А., адбылося першае афіцыяльнае пасядзэнне прадстаўнікоў Ураду Украінскай Народнай Рэспублікі і Ураду Беларускай Народнай Рэспублікі дзеля разгляду пытаңня установы межаў паміж рэспублікамі.

З боку Украінскай Народнай Рэспублікі ў пасядзэнні былі Ліхнякевіч, Сведэрскі і Пятроўскі, с боку Ураду Беларускай Народнай Рэспублікі: Цьвікевіч і Рак-Міхайлоўскі. Пасядзэнне было адчынено Ліхнякевічам, прывітаўшым ад імяні Ураду Украінскай Народнай Рэспублікі Беларускую дэлегацыю. У прамове сваей Ліхнякевіч падкрэсьліў вельмі асабістае значэнне таго факту, што прадстаўнікі Беларускаго народу ў першы раз за усю пору зьвярнуліся да Украіны і тым выказалі свае братэрскае пачуцце да Украінскаго Народу, як праводцу у будаваньні Народно - Дэмократычнай дзержавы. Беларускі Народ ні памыліўся ў сваім пацуцці і можа быць надзея, бо Украінскі народ ацэніць братэрскія адносіны свайго суседа і заўседы жадаў і будзе жадаць быць шчырым прыяцелям.

Ліхнякевічу адказваў старшыня Беларускай дэлегацыі Цьвікевіч. Дзякуючы за прывітанне, ен выказаў надзею, што Украінскі Народ, стаўшы на чале руху да нацыянальна-дзержаўнаго адраджэння, зразумее жаданне і патрэбы Беларускаго Народу і абодва народы ў хуткім часе прыйдуць да дзержаўна-братэрскіх зносін. Міжы Беларусяй і Украінай ніколі ні было сваркі, ні павінно быць ей і цяпер. Мы спадзеваемся, што прадстаўнікі Украінскаго Ураду напэўна згодзяцца на установу межаў на грунці этнографічнаго досьледу, абодвых народаў, што павінно быць фундамэнтам для спакойнаго іх жыцця.

Пасьля гэтаго на пасядзэнні былі парушаны пытанні: 1) аб прынцыпах, якімі павінна рукавадзіцца камісія пры установі дзержаўных межаў, 2) аб пляне, якім камісія будзе рукавадзіцца пры установі межаў; 3) аб асваўных пунктах на захадзі ўсходзі, якія будуць канцавымі пунктамі межаў.

Пасьля дэбатаў пастаноўлено было па пункту першаму прыняць за аснову прынцып этнографічны, але ў шчыльнум зьвязку с прынцыпам географічным і эканамічным. Па пункту другому старшыня Беларускай дэлегацыі заявіў, што ен будзе рукавадзіцца плянам праф. Карскаго выдання 1917 року. Украінская камісія, прынцыпіяльна нічого ні маючы проці пляну Карскаго заявіла, што яна апрача таго будзе рукавадзіцца сваімі этнографічнымі, эканамічнымі і інш. плянамі. Па пункту 3-му да канцавого рашэння ні дайшлі. Абвешчана пярэрва да новаго пасядзэння.

Пукай, язьмін...

Пукай, язьмін, пад вакопцам,
Ах, ўжо час, ўжо час!
Бо вясёнка з цёплым сонцам
Ужо прыйшла да нас.
* * *
Выпускай на сьвет лісточкі,
Стройся, стройся у май!
Раскрывай жа плясточкі—
Пчол, чмялёў зывай.
* * *
Заклікай на баль-пацеху
На салодкі мёд
Матылькоў, жучкоў с-падстрэхаў
Цэлы карагод!
* * *
Разлівай у паветры пахі,
Ваб, чаруй усіх...
Небо ярка. Пяюць птахі,—
Сэрцу радасьць з іх.

Ф. Калінка.

Агульныя весткі.

БЭРЛІН 26 гм. Статс-сэкрэтар ф. Кюльман выехаў учора вечарам праз Вену у Будапэшт. Партыйныя лідэры меўшыя бяседу з статс-сэкрэтаром перад яго выездам, вынеслі ўражэнне, што фармальнае заключэнне мірнай умовы з Румыніей мае наступіць у самым блізкім часе.

БЭРЛІН 24 гм. [«Вольф»]. На пасядзэнні рэйсхтагу цягнуціся далей дэбаты над праэктамі падактаў. У рэзультаце дэбатаў справы гарэльчаной манаполі і падаткаў на другія напіткі пяраданы у дзьве асобныя камісіі.

ДАНЦЫГ 24 гм. На высланую народна - лібэральным зьвязкам у Заходняй Прусіі да ген.-фэльдмаршала Гіндэнбурга тэлеграму атрымаўся такі атказ:

«Прашу народна-лібэральны зьвязак быць ў пэўнасьці, што нічога ні занедбаю, каб давясьці да патрэбнаго стратэгічнаго абэзпечэння нашыя Усходнія акраіны.

Ген.-фэльдмаршал ф. Гіндэнбург».

РОТТЭРДАМ 25 гм. «Вольф» Подлуг паведамленняў тутэйшых газэт у Дубліне зноў распачалася праца. Пастанова зробленая у Вуйвічу, якая абавязуе прыймаць учасць у народнай абароне проціў вайсковай павіннасьці ўзыскала ужо сабе мільён прыхільнікаў, як мўшчын так і кабет. Прызначаны для гэтаго фундуш, які цяпер знайходзіцца ў руках у ксендзоў шпарка расьцець. Камісія народнай абароны маець штодзенныя парады у справе арганізацыі атпору. Пасьля прыняцця ніжняй палатай гомруля ў Дубліне мае быць сход, на каторым будзе прынята пастанова аб далейшай палітыцэ.

РОТТЭРДАМ 25 гм. У «Daily Telegraph» паведамляюць з Іоганненсбурга, што тамака прыняты адкладаны да гэтаго закон аб агульным запісе усіх абавязаных у вайсковай службе ад $18^{1}/_{2}$ да 41 гад.

БРУССЭЛЬ 24 гм. «Вольф». На моцы супольнаго распараджэння ген.-губэрнатара і генэральнаго кватэрмэйстра у Фляндрыі і Валоніі будуць створаны нямецкія суды.

Глаўнымі прынцыпамі новай арганізацыі пры магчыма большай ашчаднасьці ў ужыццю да гэтаго людскай сілы ёсьць: у крымінальных справах—аграпічэнне толькі да патрэбных рэчаў для утрымання агульнаго парадку, у цывільных справах—абарона цывільна-праўных інтарэсаў немцаў, хаўрусьнікаў і нейтральных. Судовы урад як і да гэтай пары будзе ў руках шэфа судоваго аддзелу.

Замешчэнне пасадаў у новых судох хутка будзе скончано.

— Подлуг ангельскаго «Таймсу» змагання на фронце у Фляндрыі могуць цягнуцца ішчэ праз цэлае лето. Баі будуць меньш надта заўзяты характар. Яны будуць зацяжнымі і моцна кравапралітнымі. Коаліцыя мае папярпець пры гэтым вялікія ахвяры у ваенным матэріяле і людзях.

МЕНСКАЕ ЖЫЦЦЕ.

Кіпа антоў а парубках і пакражах ляснога матэрыялу у архіерэйскіх угодзьях за межамі горада перданы паветовай міліцыі у кантору архіерэйскаго дома. Парубкі і пакражы чыніліся у часе большавіцкаго панавання. Акты пярэданы чыноўнікам у належачы суд.

Харчавыя прадукты, знойдзеныя у селян, прыехаўшых на рынак 26-го г. м. былі зрэквізаваны. Ні чапалі прадуктаў у тых, якія мелі на гэта спэцыяльнае пазваленне.

Афіцыяльнае павядамленне нямецкаго вярхоўнаго камандавання за 28 красавіка 1918 року.

На Фландрскім полі бітвы непрыяцель адступіў на старыя пазыцыі. Паўднявей Лангемарку непрыяцель, незайноўшы праз Стэенбах усходней Ипэрна заняў свае пазыцыі восені 1914 року, а каля Цэллебэке нават далей ад іх. Моцно наганяючы мы ні адзін раз прымушалі непрыяцеля прыняць бой. Пры гэтым мы забралі бэльгійцаў і колькі сот ангельцаў у палон. Мы дасягнулі да лініі: поўдн.-зах. Лангемарка—заходны бераг ручая Стэен—Фэслерэхек—Хоог—Цыльбеке—Воормегселе.

С вялікай труднасьцю, заваеванае у мінулыя годы узвышшо 60 знаходзіцца у нашым уладанні. Моцная артылерыйская дзейнасьць па вучастку Кеммеля. Пасьля адбіцця французскай контр.-атакі, пачатай імі у вечары 26/IV на заходным спуску гары, наша пехата пашла у пагоню па ўласнаму пачатку за адступаючым праціўнікам і забрала Локер.

На паўднёвым берагі рэкі Ліс непрыяцельскія атакі ні ўдаліся. Пры гэтым а так сама пры удачным нашым прадпрыемстве паўночна-заходней Фестюбэру, мы забралі у палон ангельцаў. Каля Жываншы былі адбіты моцныя ангельскія атакі.

На абодвых баках Соммы баевая дзейнасьць абмежоўвалася разьведкамі і часамі парушаўшымся артылерыйскім агнем.

Каля лесу Ангар непрыяцельскія дзе-ні-дзе атакі былі зломаны.

Усход: Фінляндзія.

Генэрал граф фон-дэр-Гольц забраў з бою Тавастгус. Пры уходзі у горад нашыя атрады з радасьцю прывітаны насяленнем.

Пэршы-Генэрал-кватэрмэйстар **фон-Людэндорф.**

Хлебны паек служачым Л. Р. ж. д. павялічаны: тыя тры фунты хлеба, якія выдаваліся на тры дні, выдаюцца цяпер на 2 дні.

4-я нотарыяльная кантора, якая спыніла сваю працу ад першай эвакуацыі Менску, пачне свае функцыі праз некольні дзен. Вакантнае мейсцо займе ранейшы натарыус, каторы мае прыехаць з Масквы.

Дзе вышэйшая духоўная ўлада?—гэтым пытаннем задаецца епархіяльны ганорны суд і благочынныя округі Менскай епархіі. А даведывацца у усерасійскаго царкоўнаго сабору у Маскве нельга было покуль што, дзеля таго, што німа почты. Вышэйшай духоўнай уладай у Менску лічыцца покуль што уладыка Гэоргій, яго рашэнні па розным пытанням, нават па часьці судзебных пастановаў кансысторыі лічуцца безапэляцыйнымі. Становішчо гэто мае выясьніць у хуткім часе зьезд духавенства менскай епархіі.

«Камітэт злучаных рабочых В. З. ж. Н. З. Ф.», з'арганізаваны у першыя дні рэвалюцыі, яшчэ маячыць у Менску па сягоняшні дзень. У першыя часы свайго істнавання ен веў адважную барацьбу с сваімі палітычнымі праціўнікамі... Пасьля ен закруціўся у віхоры большэвізму. А цяперака ен займаецца шуканнем грашавых падмогаў, дзеля ліквідацыенных падрахункаў...

Ці ні пара будзе гэтым эксземгусарам да хаты?

Чыноўнікі, астаўшыся без работу у часе большэвізма (большая частка—чыны губ. праўлення) ні атрымалі пэнсыі па сягоняшні дзень за сьнежань і люты г. г. А тут ідзець сьвято і шмат з іх сямействаў ні мае і куска хлеба.

Мешчанская Управа хлапоціць аб прылучэнні яе да местоваго самаўпраўлення зусімі справамі і архівамі.

У местовай управе вялікі перепалох: маюць уразаць «гэнэральскія» аклады галавы, чл. управы і др. Галава мае атрымліваць нібы-то 125 р. у месяц! Пабачымо, якая будзе пасьля гэтаго энэргія да працы у паноў з Масковіі, запаланіўшых местовую управу?

Беларуская сталоўка мае атчыцца па ініцыятыве прэзыд. рады старшын клюбу «Беларускай Хаты» Вярнікоўскаго. Сталоўка мае быць дэмократычная. Абед—2 р. 50 к.

Другое бонавое бюро па выдачы бонавых кніжак, адчыняецца сягоння на Саборным пляцы у д. Айзэнштата.

Народны Сэкрэтар Унутрэніх спраў К. Б. Езавітаў выздаравеў і зноў пачаў сваю працу у Сэкрэтарыяце.

Беларускія яслі для грудных дзяцей—беларусаў адчыняюцца гэтымі днямі пры Беларускай пачатковай школе-сталоўцы на Камароўцы. Адкрыцце яслей вымагаецца галаданнем сярод беларускай беднаты. Апошнім часам бываюць вельмі частыя выпадкі, што маткі прыносюць дзяцей у школу і пакідаюць іх там, кажучы іх трымаць у сябе, калі ім ні дадуць падмогі.

Курсы беларусазнаўства.

29 красавіка лекцыя праф. Массонiуса «Гісторыя беларускаго языка». Пачатак у $6^{1}/_{2}$ г.



Рэдактар А. Прушынскі.

Выдавецтва Т-во «Заранка».

Друкарня Я. А. Грынбла[та]